Дзмітрый ДАВІДОЎСКІ /Мінск/

# Гістарычны лёс літаратурнага аб'яднання «Узвышша» ў дакументах і лістах Уладзіміра Дубоўкі

26 траўня 1926 г. дзесяццю былымі маладнякоўцамі было створана літаратурна-мастацкае згуртаванне «Узвышша». Заснавальнікамі яго, паводле дакументаў, сталі:

1. Атраховіч Кандрат Кандратавіч — 1896 года нараджэння;
2. Бабарэка Адам Антонавіч — 1899;
3. Глебка Пятро Тодаравіч — 1905;
4. Дубоўка Уладзімер Мік. — 1900;
5. Каратай Алесь Амвросьевіч — 1909;
6. Плаўнік Самуіл Якімавіч — 1886;
7. Плашчынскі Язэп Паўлюкоў — 1902;
8. Раманоўскі Мікола Карлавіч — 1900;
9 Серада Сяргей Міхайлавіч — 1907;
10. Шашалевіч Васіль.

У табліцы па невядомых прычынах адсутнічаюць імя па бацьку і год нараджэння Васіля Шашалевіча. Усе заснавальнікі ў спісе пададзены пад сваімі сапраўднымі прозвішчамі, а не літаратурнымі псеўданімамі.

У. Дубоўка першым прапанаваў сваім сябрам па «Маладняку» выйсці з гэтага згуртавання і ўтварыць зусім новае літаратурнае аб'яднанне, якое мела б свой статут, праграму дзейнасці і свой друкаваны орган. А прывяло паэта да гэтай думкі не літаратурнае, а хутчэй калялітаратурнае становішча «Маладняка».

Яшчэ ў лістападзе 1925 г. у У. Дубоўкі ўзніклі разнагалоссі як з ЦБ (Цэнтральным бюро) «Маладняка», так і з большай часткай яго сяброў-маладнякоўцаў. Асноўны выбух гневу на У. Дубоўку выплеснуўся пасля ягонага артыкула «Фармальна-мастацкія дасягненні маладнякоўцаў» (газета «Савецкая Беларусь», 25 лістапада 1925 г.). У гэтым артыкуле паэт крытыкуе маладнякоўцаў, але пры гэтым дае парады, як ім пазбавіцца ад памылак у творчасці, «літаратурнай мове» твораў і інш. Маладнякоўцы ж не прымалі ніякай крытыкі, і таму ў артыкуле ЦБ «Маладняка» на У. Дубоўку быў зроблены гнеўны выпад, не падмацаваны ніякім фактычным матэрыялам. Яшчэ Ант. Адамовіч у сваіх успамінах казаў, што хутка пасля ўтварэння «Маладняка» ў гэтым згуртаванні адбыўся раскол на «бурапенцаў» і «ажыўленцаў».

Да «бурапенцаў» ён аднёс Я. Пушчу, У. Дубоўку, А. Бабарэку і інш. Вось паміж гэтымі дзвюма плынямі і пачалася сапраўдная калялітаратурная вайна.

Але апошняй кропкай у адносінах У. Дубоўкі з «Маладняком» стала гнюсная рэцэнзія на зборнік вершаў У. Дубоўкі «Credo», падпісаная крыптанімам Я. Ч. На гэтую рэцэнзію паэт піша ў ЦБ «Маладняка» гнеўны ліст, які у выніку стаў заявай аб ягоным выхадзе з гэтага літаратарнага згуртавання. Надрукавана рэцэнзія была ў газеце «Савецкая Беларусь» 6 студзеня 1926 г. Паэт пісаў: «Аўтар гэтай заметкі, якому сорамна самога сябе, схаваўся за дзве літары і за абвешчаных на тытульнай старонцы рэдактароў. Паколькі пад заметкай няма заўвагі ад рэдакцыі, прыходзіцца лічыць яе выражэннем поглядаў рэдактароў, двое з якіх зьяўляюцца членамі Цэнтральнага бюро «Маладняка». Сам ліст займае тры старонкі машынапісу і заканчваецца запэўніваннем у тым, што калі праз 10 дзён не будзе адказу на гэты ліст, то У. Дубоўка падасць заяву аб выхадзе з «Маладняка». Датаваны ліст 26.04.1926. Тое, што ён стаў адначасова і заявай аб выхадзе, сведчыць прыпіска пад «Зваротам групы паэтаў-маладнякоўцаў у бюро ЦК КП/б/Б з просьбай дазволіць стварэньне самастойнага літаратурна-мастацкага згуртаваньня». Подпіс У. Дубоўкі стаіць першым і насупраць яго у дужках напісана: «Падаў заяву аб выхадзе з «Маладняка» 26.04.26 г.» Падпісалі «Зварот...» (паводле арыгіналу): У. Дубоўка, Я. Пушча (Плашчынскі), К. Чорны (Раманоўскі М.), А. Бабарэка, З. Бядуля (Далучаюся да п.6), Крапіва (Атраховіч).

Шосты пункт, да якога далучыўся Змітрок Бядуля, — гэта просьба аб дазволе выдаваць свой друкаваны орган. Аўтары «Звароту» ў тэксце дакумента далі зразумець, што ў выніку расколу «Маладняка» яго далейшае існаванне пры двух варожа настроеных лагерах немагчымае. Таму яны і звяртаюцца па дазвол на ўтварэнне новага самастойнага літаратурна-мастацкага згуртавання і яго друкаванага органа. Сам «Зварот...» датаваны 26 траўня 1926 г. Менавіта гэтая дата і лічыцца датай утварэння «Узвышша». Хаця зарэгістрвана яно было значна пазней — спачатку ЦК КП/б/Б , а потым і НКУС.

Усе асноўныя дакументы літаратурна-мастацкага згуртавання «Узвышша» прайшлі праз бюро ЦК КП/б/Б. У архівах захаваліся дакументы, якія сведчаць аб тым, што ўся праца над «Статутам Беларускага літаратурна-мастацкага згуртавання «Узвышша» ішла пад пільным наглядам ЦК. Дзеля гэтай мэты быў замацаваны юрыст, які даваў парады і рабіў праўкі ў тэксце дакумента. Той «Статут...», які быў надрукаваны ў першым нумары часопіса «Узвышша», — гэта вынік шматмесячнай працы над дакументам.

Зацверджаны «Статут...» быў 3.12.1926, ён мае рэгістрацыйны нумар 15152, і на ім стаіць наступная рэзалюцыя: «Статут гэты зацвержаецца. 3.XII-26 № 15152. Зам. наркома Кароль»: Далей адціснута факсімільна: «Сэкратар Наркамуспраў Б.С.С.Р.», — і побач подпіс сакратара НКУС Івана Восіпавіча Блізнюка. Пад самой гэтай рэзалюцыяй, на левым полі, зроблены чарнілам надпіс: «Арыгінал зацьверджанага статуту атрымаў. М. Раманоўскі (К. Чорны). 4/XII-26».

Ёсць і іншыя дакументальныя звесткі пра рэгістрацыю «Узвышша». Юрыстам, напрыклад, былі выкрэсленыя пункты «Статута», у якіх крытыкаваўся «Маладняк». Трэба прызнаць, што ў такім падыходзе была рацыя, бо ў тым літаратурным становішчы, якое склалася на момант утварэння і рэгістрацыі «Узвышша», любы рэзкі крок мог стварыць пагрозу для літаратурнага руху наогул.

Сам працэс рэгістрацыі расцягнуўся больш як на тры месяцы. Абмеркаваны «Статут» быў 20 жніўня 1926 г. на агульным сходзе «Узвышша», на якім таксама быў прыняты і «Зварот...». Па даручэнні сходу «Статут» быў пададзены для рэгістрацыі ў НКУС.

Старшынёй новага літаратурнага аб'яднання быў абраны Кузьма Чорны (Мікалай Карлавіч Раманоўскі), а літаратурным сакратаром — Адам Бабарэка. Юрыдычна Уладзімір Дубоўка знаходзіўся на другіх ролях, але фактычна ён узначальваў згуртаванне. Аб гэтым яскрава сведчаць, у прыватнасці, ягоныя лісты да А. Бабарэкі. Пяру У. Дубоўкі належаць тэксты ўсіх дакументаў літаратурна-мастацкага згуртавання «Узвышша». Гэта і «Статут «Узвышша», і зварот «Ад беларускага літаратурна-мастацкага згуртавання «Узвышша», і тэзісы «Узвышша», якія ўласна і з'яўляюцца праграмай.

Паводле задумы «Узвышша» мела на мэце змагацца за чысціню мовы і за цесную сувязь твораў з жыццём. Аб гэтым яскрава сказана ў п. 8 звароту «Ад беларускага літаратурна-мыстацкага згуртавання «Узвышша»: «Магчымасьць утварэньня беларускай літаратуры мысьліцца цераз: а) культуру беларускае мовы, б) жыцьцёвую сімволіку мастацкага твора, в) яго канцэнтрацыйную вобразнасьць, г) дынамічнасьць кампазіцыі, д) адзінства творча-мастацкай ідэі, ж) разнастайнасьць фармальных рэальнасьцяў, з) аквітызм як тую імклівасьць, якою прасякаецца мастацкі твор у сваім ідэале...»

Ужо адзначалася, што У. Дубоўка быў фактычным кіраўніком «Узвышша». Так, у 1928 годзе паэт вырашае змяніць вокладку часопіса, каб яна ад-

павядала зmененай літаратурнай сітуацыі. Ён заключыў дамову з вядомым у той час мастаком М. М. Аксяльродам і выдаў яму частку ганарару авансам, пра што паведаміў у лісце А. Бабарэку. Першы нумар часопіса за 1929 г. выйшаў ужо з новай вокладкай. Часопіс па-ранейшаму заставаўся адным з самых папулярных перыядычных выданняў з накладам у 1000 асобнікаў. Гэта больш, чым наклад часопісаў «Маладняк» і «Полымя». І толькі ў 1930 годзе наклад часопіса зменшыўся, бо пачалося выкрыццё «ворагаў народа». У. Дубоўка сам вырашаў і такія пытанні, з якой друкарняй супрацоўнічаць, як сабе паводзіць у той ці іншай сітуацыі. Аб гэтым гавораць лісты паэта да А. Бабарэкі. Вось, напрыклад, урывак з ліста ад 3.10.1928:

«Масква. Братка Адам! Атрымаў часопісь! Страшэнна многа памылак. Мабыць, трэба развітацца з Гомелем і даць друкаваць у Менску. Абмяркуйце гэтае пытанне. Можна нават з нумара 5...» (Далей у лісце ідзе пералік вельмі грубых памылак, якія недаравальны для беларусканоунай друкарні.)

Пісаў У. Дубоўка лісты да свайго сябра і паплечніка штодня, а ў некаторых выпадках па два-тры разы на дзень. Вось яшчэ адзін ліст:

«10.XII.28 г., Масква. Браток Адам! На твой ліст адкажу пасля. Сёння азнаёміўся з некаторымі матэрыяламі. Адносна «беларускіх» пісьменнікаў у універсітэце (нават у «Палескай праўдзе» ёсць цікавы артыкул). Калі нашыя хлопцы яшчэ не падалі свайго пратэсту — няхай пададуць. Калі падалі яны — варта адгукнуцца ўсім нам. Тутака справа стаіць значна шырэй, чымся гэта здаецца нам. Трэба падаваць пратэст як мага хутчэй, трэба рашуча адмежавацца ад усяго гэтага барахла. Калі не выдрукуюць у газеце, дайце ўклейку у нумар 5. Пратэст пабудуйце у такім плане.

1. Справу з «беларускімі» пісьменнікамі трэба разглядаць шырэй, чымся гэта робіцца, бо яна не замыкаецца ў рамках педфаку, а цягнецца на працягу двох гадоў на Беларусі наогул.

2. Пэўная група пісьменнікаў на чале з Ц. Гартным часткова ці поўнасцю заняўшы кіраўнічыя пасады ў «Савец. Беларусі», «Полымі», «Дзяржаўным Выдавецтве», «Наркамасветы» (Галоўмастацтва) атрымала магчымасць рэгуляваць крытыку адносна сваіх твораў, друкаваць іх, уціскаючы іншых пісьменнікаў, чамусьці «няўгодных» прэзэсу гэтай групы. Так, на працягу ўсяго часу, Бел. Дзярж. В-ва ўпарта не выдучала аркушаў белкрытыку Адаму Бабарэку, пазбавіла чамусьці магчымасці друкаваць свае творы там Максіма Гарэцкага, Дубоўку (апошні змушаны быў выдрукаваць апошні свой зборнік у Маскве, у «Центриздате»). Гэта ўсё прымусіла Зм. Бядулю і К. Чорнага, прынятыя да друку творы якіх «марынаваліся», узняць рашучы пратэст. Тут жа справа з бюлетэнем «Сувязі з па-за межамі» і гэтак далей.

3. Прывілеяванае становішча групы Ц. Гартнага давяло яе да таго, што асмелілася заяўляць, што толькі яна рэпрэзентуе беларускую літаратуру, што на Беларусі нікога больш не існуе, літаральна цкуюць няўгодных сабе.

4. Занятыя творчай справай, мы не звярталі на гэта ўвагі. Зараз жа змушаны канстатаваць, што такая ўпрывілеяванасць завяла іх вельмі далёка — да кампраметацыі беларускай літаратуры на Беларусі і па-за яе межамі. Так, усім вядома «выступленне» Ц. Гартнага, Дудара і г. д. у Беларускай С. Г. Акадэміі, якое выклікала рэзкі пратэст тамтэйшага студэнцтва. Зараз паўтараецца нешта падобнае ў дачыненні да Бел. Дзярж. Ун-ту. Гэта ўсё ўваходзіць у сістэму.

5. Далучаючыся цалкам да зусім справядлівых пратэстаў студэнцтва і кіраўніцтва БДУ, мы адначасна ўважаем патрэбным заявіць, што нармальныя суадносіны ў беларускім літар. жыцці ўстановяцца толькі тады, калі будзе запяспечана незалежнае ад групы Ц. Гартнага кіраўніцтва Бел. Дз. В-ва, Галоўмастацтва і Сав. Беларусі, якія дадуць магчымасць друкавацца ўсім пісьменнікам і г.д.

Не пазнецеся! Калі будуць адмаўляць у дазволе на выдрукаваньне, ідзіце дэлёгацыяй да новага сакратара. Міру з Цішкам быць у нас не можа — карыстайце выпадак. Калі б гэты ліст тэрмінова выдрукавалі — падлічыце свае сілы, рэальныя магчымасці і гарантыі на поспех... Маруднасьць згубіць усё...

Цалую, вітаем. Пішы. Уладзік».

Гэты вялікі ліст сведчыць, што У. Дубоўку хвалявала ўсё, што рабілася не толькі ў згуртаванні, але і вакол яго. Ён рашуча ўступаў у бой за тое, каб ніхто не крыўдзіў беларускага пісьменніка. Паэт не мог дараваць нават такому аўтарытэту, як Ц. Гартны. У іншых сваіх лістах паэт звяртае ўвагу на праблемы згуртавання і прапануе нават ліквідаваць «Узвышша», каб калі не пазбегнуць, то хаця б крыху зменшыць ахвяры: пачыналіся рэпрэсіі...